

Жыве Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№15 (1032) 21-23 студзеня 1995 г. Субота-панядзелак. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 548972 экз. Кошт у розніцу — 200 руб.

Чым жыве глыбінка?

Старшыня Вярхоўнага Савета рэспублікі Мечыслаў Грыб знаходзіцца з рабочым візітам на Віцебшчыне

Сваё знаходжанне на Віцебшчыне кіраўнік парламента Мечыслаў Грыб пачаў 18 студзеня з наведвання аддаленых куткоў вобласці. У Докшыцкім раёне ён сустрэўся з рабочымі саўгаса "Порплішча", наведаў Бягомльскую школу-інтэрнат, у Глыбоцкім Старшыня Вярхоўнага Савета зацікавіўся дзейнасцю прадпрыемстваў перапрацоўчай прамысловасці. Як на кансервавым заводзе, так і на мясакансервавым камбінаце прымаюцца меры па пераасначшчэнню і мадэрнізацыі вытворчасці, прадукцыя глыбоцкіх перапрацоўшчыкаў здольна вытрымліваць канкурэнцыю і на ўнутраным, і на знешнім рынках. Але многае перашкаджае калектывам разгарнуцца ў поўную сілу. Аб гэтым ішла размова як у час гутарак у цэхах, так і на сесіі Глыбоцкага раённага Савета дэпутатаў, у рабоце якой прыняў удзел Мечыслаў Грыб.

Тыя ж праблемы хвалююць і калектыў АТ "КІМ" у Віцебску, з якім сустрэўся 20 студзеня кіраўнік заканадаўчай улады. У гэты ж дзень Мечыслаў Грыб правёў прыём насельніцтва горада па асабістых пытаннях.

Камандаванне 103-й гвардзейскай ордэна Леніна, Чырванасцяжнай, ордэна Кутузава 2-й ступені паветрана-дэсантнай дывізіі, што дыслацыруецца ў Віцебску, запрасіла Мечыслава Іванавіча на ўрачыстасці з выпадку 50-годдзя праслаўленага злучэння.

Вольга СІДАРОВІЧ, Белінфарм.



Вкратце

Премьер-министры Польши и Беларуси Вольдемар Павляк и Михаил Чигир встретятся в Бресте 21 января.

Планируется, что в ходе встречи премьеры подпишут Декларацию о развитии экономического сотрудничества.

❑

Министерство статистики и анализа Беларуси сообщило, что в декабре в сравнении с ноябрем 1994 года индекс цен производителей продукции производственно-технического назначения составил 129,7 процента.

❑

Курс доллара США на торгах Московской межбанковской валютной биржи 20 января составил 3947 рублей за доллар. Это на 31 рубль больше предыдущего показателя.

Дмитрий Булахов взял "вес"

Как сообщили корреспонденту агентства РИД в пресс-службе Партии всебелорусского единства и согласия, лидером этой организации стал народный депутат Дмитрий Булахов.

Как известно, Булахов возглавляет парламентскую комиссию по законодательству и является представителем Президента в Верховном Совете. Судя по всему, накануне парламентских выборов Дмитрий Петрович решил играть самостоятельно. В понедельник, 23 января, он планирует провести пресс-конференцию для журналистов, на которой намерен разъяснить свою позицию.

Война не разбирает, кто свой, кто чужой

Черное крыло войны в Чечне коснулось Беларуси. Житель Солигорска Анатолий З. похоронил брата Сергея, ставшего очередной жертвой вооруженного конфликта на юге России.

11 января Сергей ехал на своих "Жигулях" в Моздок, когда автомашина была обстреляна из автоматического оружия группой неизвестных. От полученных ран Сергей скончался. У погибшего была мирная профессия — строитель.

Ян ВЕРБА.

Водка снова подорожала

Видно, крепкий напиток может не только согреть, но и нанести урон семейному бюджету, потому что стоимость его постоянно повышается. И, по сообщениям Комитета цен Министерства экономики республики, с 21 января опять повышаются в среднем на 25 процентов фиксированные розничные цены на белую водку.

Теперь за пол-литровую бутылку "Пшеничной" и "Столичной" вместе с посудой придется платить 8860, "Московской" и "Русской" — 8780, "Белой Руси" — 9410 рублей. Но по таким ценам ее можно будет приобрести в обычном оформлении, в экспортном же водка обойдется приблизительно на триста "зайчиков" дороже.

Михаил ЖУРАВОВИЧ.

Борис, не трогай "вертикаль"!

Опять отличился неугомонный, известный своими наскоками на чиновничью "рать" депутат Витебского облсовета Борис Матвеев.

Он обратился в прокуратуру области с запросом, где высказано мнение, что представители "президентской вертикали", назначенные в последнее время на чрезвычайных сессиях областных, городских и районных Советов, нарушили статью 2 принятого в 1993 году Закона "О борьбе с преступностью в сфере экономики и коррупцией".

Депутат напомнил, что закон требует, чтобы государственные служащие при назначении на должность представляли декларацию о своих доходах с обнародованием ее в печати. Ни один из вновь утвержденных руководителей исполнительной власти на Витебщине этого пока не сделал. Матвеев рассчитывает, что прокуратура заставит их отчитаться за содержимое своих "кошельков".

Степан СТАРОЖИЛ.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, Интерфакс, БелаПАН, РИД.

Дыпламатычны кур'ер

Дзень з Андрэем Козыравым

Візіт у Мінск кіраўніка знешнепалітычнага ведамства Расійскай Федэрацыі, мяркуючы па ўсім, паставіць кропку ў падрыхтоўцы прыезду ў Беларусь прэзідэнта Барыса Ельцына, які, відаць, можа адбыцца ў лютым бягучага года.

Паводле звестак Белінфарма, праграма знаходжання расійскага міністра ў Мінску вельмі насычаная. Ён прыбудзе ў сталіцу рэспублікі вечарам 23 студзеня і ў гэты ж дзень правядзе перагаворы з міністрам замежных спраў Беларусі Уладзімірам Сянько. Наступны дзень, 24 студзеня, Андрэй Козыраў пачне з перагавораў з беларускім міністрам замежных спраў ва ўрадавай рэзідэнцыі, размешчанай у Вайсковым завулку, дзе таксама адбудуцца падпісанне пакета беларуска-расійскіх пагадненняў і кароткі брыфінг для беларускіх і замежных журналістаў.

На працягу дня А.Козыраў сустрэнецца і правядзе перагаворы з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам, кіраўніком Кабінета Міністраў Міхаілам Чыгіром, спікерам парламента Мечыславам Грыбам і выканаўчым сакратаром СНД Іванам Каратчэняй. Акрамя таго, ён наведае Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, дзе азнаёміцца з экспазіцыяй і прыме ўдзел у цырымоніі перадачы расійскаму боку ікон, канфіскаваных беларускімі пагранічнікамі.

Андрэй Козыраў — міністр замежных спраў Расійскай Федэрацыі

Нарадзіўся 27 сакавіка 1951 года. Рускі. Жанаты, мае дачку. Закончыў Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін МЗС СССР. Валодае англійскай, партугальскай, іспанскай мовамі. Дыпламатычны ранг — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол. Кандыдат гістарычных навук.

Працоўную дзейнасць пачаў у 1968 годзе слесарам-зборшчыкам на маскоўскім машынабудаўнічым заводзе "Камунар". З 1969 па 1974 год — студэнт МДІМА МЗС СССР. Пасля заканчэння ВНУ да 1986 года працаваў рэферэнтам, старшым рэферэнтам, трэцім, другім і першым сакратаром, саветнікам аддзела міжнародных арганізацый МЗС СССР, а затым два гады з'яўляўся загадчыкам гэтага аддзела. З 1988 па 1989 год — начальнік упраўлення міжнародных арганізацый МЗС СССР. З 1990 года з'яўляецца міністрам замежных спраў Расійскай Федэрацыі.

Аляксандр ЛЮШКЕВІЧ, Белінфарм.

Усход становіцца бліжэйшым

Вялікі — гэта слова папулярнае ў Кітаі. Але сказаць аб тым, што Шанхай — вялікі горад, значыць, нічога не сказаць. Бадай, у дадзеным выпадку найбольш да месца вызначэнне "ўражваючы".

Як ужо паведамлялася, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і суправаджаючыя яго асобы прыбылі ў Шанхай 18 студзеня вечарам. І адразу былі зачараваныя гэтым незвычайным горадам. Вось прыклады.

У мінулым годзе валавы прадукт Шанхая склаў 40 працэнтаў ад выпрацаванага па ўсёй КНР. А тут жа хоць і пражывае 13 мільёнаў чалавек, але гэта толькі адзін (!) працэнт насельніцтва краіны. Здзіўляючыя вынікі дасягнуты ў многім дзякуючы свабоднай эканамічнай зоне Пудун, якую наведала беларуская дэлегацыя. І такіх дзяржаўных зон у Кітаі — 102.

Паспяховы рух наперад па шляху рэформ самі кітайцы тлумачаць, у першую чаргу, стабільнасцю палітычнай сітуацыі ў краіне, упэўненасцю інвестараў у тым, што іх намаганні, як кажуць, не пойдуць прахам.

Акрамя шматлікіх дзелавых сустрэч праграма візіту ўключала і знаёмства з тымі месцамі горада, якімі асабліва ганарацца кітайцы. Члены дэлегацыі агледзелі мост Наньпу, даўжыня якога 8350 метраў, наведалі сад Юйюань, дзе ўражваюць прыгажосцю архітэктурныя пабудовы чатырохвекавой даўнасці... Між іншым уражваюць і сучасныя збудаванні. У горадзе пачалося будаўніцтва новага атэля ў 88 паверхаў, узводзяцца банкі, офісы, жылыя дамы... Шанхай будуецца, будуецца, будуецца... Але застаюцца нявырашанымі дзве галоўныя праблемы: жыллё і транспарт. І, магчыма, вырашыць хаця б адну з іх дапаможа беларуская прадукцыя.



❑ *Цырымонія падпісання сумесных дакументаў.*

Фота Аляксандра ТАЛОЧКІ. Белінфарм.

Па шляху дадому гутарылі аб выніках візіту. Вось некаторыя меркаванні.

Сяргей ЛІНГ:

— У Кітая вялікі вопыт барацьбы з інфляцыяй. У гэтых адносінах таксама ёсць чаму павучыцца, што і рабілі нашы міністры і прамыслоўцы ў час візіту.

Прэзідэнт сустрэўся з вышэйшымі службовымі асобамі краіны. Адбыліся вельмі карысныя перагаворы. Прэм'ер-міністр КНР Лі Пэн прыняў запрашэнне наведаць Беларусь ужо ў бягучым годзе, а гэта пра многае гаворыць.

Уладзімір ВОЛКАЎ, дырэктар Мінскага завода калёсных цягачоў:

— Мы сустрэліся са сваімі партнёрамі — прадстаўнікамі кампаніі "Вялікая кітайская сцяна". Іх патрэбнасць у нашых аўтамабілях толькі па трох агаворaных праектах складае ад 300 да 500 у год. Шмат гэта ці мала? Дастаткова сказаць, што ў свой самы ўдалы 1989 год мы вырабілі ўсяго 920 машын. Так што лічба мяркуемага збыту прадукцыі даволі значная.

Анатоль РУСЕЦКІ, прэзідэнт канцэрна "Планар":

— Для мяне гэты візіт прадоўжыў пачатае раней супрацоўніцтва ў галіне высокіх тэхналогій. Мы разам вядзём розныя работы па электроніцы, падпісалі пяць кантрактаў.

Павел МАРЫЕЎ, генеральны дырэктар Беларускага аўтамабільнага завода:

— Наша прадпрыемства чвэрць стагоддзя прадае свае самазвалы на рынку Кітая. Цяпер тут працуе каля 4 тысяч кар'ерных самазвалаў. Здавалася б, становішча добрае. Аднак за апошнія два гады нам не ўдалося прадаць у Кітай ні адной машыны. Гэта паспяхова робяць за нас расійскія камерцыйныя структуры, якія заняліся рээкспартам у рамках прыгранічнага гандлю. Таму праправацана новая канцэпцыя выхаду на кітайскі рынак. Мы падпісалі пагадненне аб будаўніцтве тут зборачнай вытворчасці, а таксама наладзім тэхнічнае абслугоўванне раней пастаўленых самазвалаў.

... Цяпер паняцце "далёкія краі" — адноснае, сказаў напярэдадні візіту ў КНР Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. У ходзе візіту мы пераканаліся ў справядлівасці гэтага выказвання.

Іван ЗНАТКЕВІЧ.

Па чутках і на самай справе

Дык ці "прадаліся маскалям" брэсцкія газаапаратчыкі?

Васіль САРЫЧАЎ, уласны карэспандэнт "Народнай газеты" па Брэсцкай вобласці

Так, з восені мінулага года Брэсцкі завод газавай апаратуры працуе ў структуры гіганта расійскай індустрыі РАТ "Газпрам", уступіўшы апошняму кантрольны пакет акцый свайго прадпрыемства. Але давайце разбяромся: стаў з гэтай прычыны завод на калені ці, наадварот, падняўся з жывата?

Гісторыя гэтых узаемаадносін ідзе каранямі ў савецкае мінулае. Брэсцкі "Газаапарат" быў адным з моцных заводаў, вядомых прадукцыяй за межамі СССР. Мінгазпрам СССР і канцэрн "Газпрам", які стаў яго пераемнікам, адносіліся да брэсцкага прадпрыемства з вялікай павагай, апошнім знакам якога стала выдзяленне 50 мільёнаў долараў на закупку для яго навейшай заходнегерманскай тэхналогіі вытворчасці ачаговых кранаў. Пад гэту вытворчасць, якая абяцала стаць адной з галоўных "изюмин" завода, польскай фірме "Энергаполь" заказалі будаўніцтва новага вытворчага корпуса з умовай расплаты прыродным газам.

Тут Саюз і распаўся.

Як і многія прадпрыемствы, "Газаапарат", які на 95 працэнтаў залежаў ад паставак блізкага і далёкага замежжа, апынуўся ў стане "грогги". З прычыны новых выдаткаў у вытворцы лепшых у Садружнасці газавых пліт склаліся такія цэны, што ён ледзь не застаўся без рынку збыту. Патрэбнасць Беларусі не перавышала пятай часткі вырабляемага "Газаапаратам", а Расія аддавала перавагу ўступаючым па якасці, але недарагім плітам уласных прадпрыемстваў. Расійскі "Газпрам" паводзіў сябе па-джэнтльменску, па інерцыі працягваючы аказваць пэўную дапамогу, але гэта было, зразумела, не тое. Стаў недабудаваны новы корпус, адышло "Газпраму" суперсучаснае абсталяванне для вытворчасці названых кранаў — рэальнай крыніцы валюты. А без апошняй пацягнуўся цэлы ланцужок, у якім нават галоўны козыр і прадмет гордасці завадчан у апошнія гады — асвоеная першай у Саюзе унікальная тэхналогія сухога эмаліравання — зайграў супраць сваіх: для яе патрэбна была асаблівай якасці заходняя сталь. Альтэрнатывай было вяртанне да састарэлых тэхналогій, вялікая страта ў якасці і згортванне вытворчасці.

У гэтым крытычным становішчы "Газаапарат" знайшоў, магчыма, адзіны ход. Пераканаўшы ўрад, Знешэканамсувязь, Дзяржкаммаёмасць, завод, які акцыяніраваўся, пайшоў на ствярэнне сумеснага беларуска-расійскага прадпрыемства, доля Расіі ў якім па яе абавязковай умове складала 51 працэнт. Заўважым, "Газаапарату" не давялося пры гэтым нічога аддаваць або прадаваць, ён увайшоў у СП сваімі асноўнымі фондамі як устаўной доляй, а расійскі працэнт выліўся ў 40 мільёнаў дойчмарак чыстых інвестыцый. На гэту суму заводу дапамаглі дабудаваць корпус, паставілі навейшую лінію для вытворчасці ачаговых кранаў гадавой магутнасцю 4 мільёны штук (пры ўласнай патрэбнасці завода 2 мільёны адзін мільён кранаў складзе экспарт у далёкае замежжа), абсталявалі вельмі неабходны заводу інструментальны цэх, аснасціўшы яго па апошняму піску — швейцарскімі прэцызійнымі станкамі з перападрыхтоўкай персаналу прадстаўнікамі завода-вытворцы. Аднавілася давер'е ранейшых расійскіх партнёраў — стабілізаваліся пастаўкі камплектуючых і сыравіны, адкрылася новая, сумесная з Екацярынбургам вытворчасць мікрахвалевых печаў, завод змог прадоўжыць удасканаленне сваёй асноўнай прадукцыі, плануючы на другі квартал гэтага года выпуск зусім новай гамы газавых пліт з дзесяці мадыфікацый.

Што тычыцца дывідэндаў, то размова аб іх падзеле яшчэ не заходзіць. "Газпрам" пытанне не фарсіруе, разумеючы, што залатыя яечкі курыца нясе далёка не адразу.

Пацiскаючы плячамі на папрокі тыпу "прадаліся маскалям", прадпрыемства жыве па нашым заканадаўстве, спраўна папаўняе бюджэт падаткамі і адно з нямногіх у рэспубліцы захоўвае стабільнасць. Для насельніцтва ж істотна, што завод жывы, што лепшыя ў СНД газавыя пліты і "мікрахвалеўкі" не пераводзяцца ў магазінах і радуюць кухні новых кватэр, што за апошнія гады "Газаапарат" не скарачаў ніводнага рабочага месца, а сярэдняя зарплата па заводу склала на канец года 300 тысяч рублёў. Грамадская думка назвала генеральнага дырэктара "Газаапарата" Міхаіла Іофе ў ліку галоўных прэтэндэнтаў на тытул "Брэстаўчанін-94". У Брэсце зусім не лічаць, як бачыце, што ён "прадаў Радзіму"...

Веру ў адраджэнне Беларусі

У апошні час, здаецца, ідзе новае наступленне Германіі на беларускія землі. На гэты раз, праўда, гуманнае і мірнае

Нямецкія дзяржаўныя і дабрачынныя арганізацыі аказваюць найбольшую ў параўнанні з іншымі краінамі практычную дапамогу нашай рэспубліцы, якая пацярпела ад чарнобыльскай катастрофы. А нямецкія прадпрымальнікі актыўна асвойваюць тутэйшы рынак. "Эканамічнае наступленне" Германіі на Беларусь — тэма гутаркі карэспандэнта Белінфарма з першым сакратаром пасольства ФРГ у Мінску Іаханесам Рэгенбрэхтам.

— Паводле даных Міністэрства знешніх эканамічных сувязей Беларусі, Германія сёння знаходзіцца на другім, пасля Польшчы, месцы па колькасці адкрытых у нас у краіне прадстаўніцтваў розных фірм. А як вы, пан Рэгенбрэхт, ацэньваеце актыўнасць нямецкіх дзелавых колаў на тутэйшым рынку? Колькі створана імі прыватных або сумесных з беларускімі прадпрымальнікамі прадпрыемстваў?

— Перш за ўсё павінен заўважыць, што шлях, па якім нямецкія фірмы і прадпрыемствы ідуць у Беларусь і пачынаюць тут сваю дзейнасць, — сапраўды гуманны і мірны. Толькі два свежыя прыклады. У сярэдзіне снежня ў Мінску пад сумесным кіраўніцтвам віцэ-прэм'ера Сяргея Лінга і статс-сакратара міністэрства эканомікі ФРГ доктара фон Вюрцэна адбылося трэцяе пасяджэнне германа-беларускага савета эканамічнага супрацоўніцтва. І другі: 13 снежня ў Мінску быў заснаваны клуб германскай эканомікі. У яго ўваходзяць прадстаўнікі вядомых у ФРГ фірм або сумесных з беларускімі калегамі прадпрыемстваў, якія пастаянна знаходзяцца тут. Яны вырашылі аб'яднацца, каб аказваць дапамогу адзін аднаму, у вольны час разам арганізоўваць мерапрыемствы і рэгулярна абменьвацца інфармацыяй. Гэты прыклад гаворыць аб зацікаўленым супрацоўніцтве з Беларуссю і аб тым, што актыўнасць тут нямецкіх бізнесменаў у бліжэйшым будучым толькі ўзрасце. А пакуль што, паводле звестак, якія я маю на 1 жніўня, у Беларусі зарэгістравана 199 сумесных беларуска-германскіх прадпрыемстваў, а таксама 59 прадстаўніцтваў нямецкіх фірм.

— Актыўнасць дзелавых колаў Германіі ў нашай краіне зразумелая: выгаднае становішча Беларусі ў еўраазіяцкай сістэме транснацыянальнага руху тавараў. А назавіце нямецкія фірмы, што робяць у нас бізнес, якія дабіліся вялікага поспеху. Як, па-вашаму, пан Рэгенбрэхт, на чым заснаваны іх поспех?

— Мне цяжка назваць паспяхова працуючыя тут фірмы, паколькі яны не падсправаздачныя пасольству аб сваім тавараабароце. Таму я абмяжуюся тым, што назаву найбольш вядомыя нямецкія фірмы ці міжнародныя канцэрны, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць у Беларусі пры дапамозе даччыных прадстаўніцтваў у Германіі. Частка іх ужо на працягу доўгага часу супрацоўнічала з Беларуссю, калі яна была яшчэ ў складзе Савецкага Саюза, і мае шматгадовыя трывалыя кантакты і традыцыі. Зараз ранейшае супрацоўніцтва працягваецца нават больш інтэнсіўна. Прыклад гэтаму фірма "АББ", якая займаецца ў асноўным пытаннямі электратэхнікі і будаўніцтва электрастанцый. А таксама "БАСФ", які супрацоўнічае з беларускімі партнёрамі па розных напрамках хімічнай прамысловасці.

Трэба назваць і прадстаўніцтва акцыянернага таварыства "Байер АГ", якое было адкрыта ў Беларусі ў сярэдзіне мінулага года. А ў ліку буйнейшых банкаў, прадстаўленых у вашай краіне, ёсць і шырока вядомы "Комерцбанк". Зараз ідзе падрыхтоўка да рэгістрацыі ў Мінску і адкрыцця прадстаўніцтва "Дрэзднер банка".

У шэрагу працвітаючых прадпрыемстваў можна назваць германскую авіякампанію "Люфтганза", фармакалагічную фірму "Фрэзеніус". Апошняя, дарэчы, стварыла сумеснае прадпрыемства "Фрэбар" у Барысаве, якое выпускае медыцынскія прыборы і нават экспартуе іх у Германію.

Акрамя таго, ёсць мноства нямецкіх фірм, якія займаюцца перавозкамі, правядзеннем выставак і кірмашоў, кансультацыйнай і гандлёвай дзейнасцю. Паводле маёй ацэнкі, у Беларусі дзейнічае каля 30 ці 40 фірм, на якіх працуюць прыехаўшыя з Германіі спецыялісты.

— У чым канкрэтна праяўляецца ўдзел пасольства ФРГ у эканамічным супрацоўніцтве нашых краін?

— Роля дзяржавы і пасольства як прадстаўніка федэральнага ўрада, канешне, вельмі абмежаваная. Яна заключаецца ў тым, каб забяспечваць сумесна з беларускім урадам рамачныя ўмовы эканамічнага супрацоўніцтва, кансультаваць і пры неабходнасці дапамагаць патэнцыяльным нямецкім інвестарам, а таксама працуючым тут дзелавым людзям. Мы лічым, што эканоміка павінна рабіцца самой эканомікай! Рашэнні аб укладанні інвестыцый прымаюцца не ўрадамі, а самімі фірмамі. Аднак я назаву некалькі прыкладаў двухбаковага супрацоўніцтва нашых урадаў на працягу трох гадоў: гэта значыць з таго часу, як паміж ФРГ і Беларуссю былі ўстаноўлены дыпламатычныя адносіны.

Адным з галоўных інструментаў нашых эканамічных сувязей з'яўляецца германа-беларускі савет эканамічнага супрацоўніцтва. Гэты орган пад эгідай федэральнага міністэрства эканомікі Германіі і кабінета міністраў, Міністэрства знешніх эканамічных сувязей Рэспублікі Беларусь садзейнічае ўстанаўленню кантактаў паміж фірмамі абедзвюх краін, зацікаўленых у супрацоўніцтве. Пасяджэнні савета адбыліся ўжо тройчы: у 1992 годзе ў Мінску, у 1993 годзе ў Боне. Апошняя сустрэча, як я ўжо казаў вышэй, адбылася ў Мінску з 13 па 15 снежня мінулага года. Гэтае пасяджэнне савета дало новы і важны імпульс для расшырэння эканамічных сувязей паміж нямецкімі і беларускімі прадпрыемствамі.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

"Палескі край" № 3

Сёння падпісчыкі "Народнай газеты" палескага рэгіёна атрымаюць чарговы нумар нашага бясплатнага суботняга дадатку. Як і два папярэднія, ён змяшчае разнастайную інфармацыю мясцовага характару.

Напомнім, што газета "Палескі край" распаўсюджваецца ў наступных раёнах: Бярозаўскі, Іванаўскі, Драгічынскі, Пінскі, Столінскі, Лунінецкі, Ганцавіцкі, Івацэвіцкі, Мазырскі, Калінкавіцкі, Петрыкаўскі, Лельчыцкі, Брагінскі, Жыткавіцкі, Хойніцкі.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб узнагароджанні групы работнікаў адкрытага акцыянернага таварыства "Белпрампраект" Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

За шматгадовую добрасумленную працу, важкі асабісты ўклад у праектаванне аб'ектаў гаспадарчага прызначэння ўзнагародзіць Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь:

ЛІЎШЫЦА Леаніда Мендзелевіча — галоўнага спецыяліста аддзела водазабеспячэння.

СІНІЦЫНА Дзмітрыя Аляксандравіча — начальніка аддзела аўтаматызацыі праектавання.

ШАФРАНОВІЧА Аляксандра Сцяпанавіча — галоўнага архітэктара праектаў.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ.

16 студзеня 1995 г., г.Мінск. N 3523-ХП

СВЯТА СЯРОД БУДНЯЎ

Юбілейны "дэсант" у Віцебску

У лепшых вайсковых традыцыях — з прадуманай тактычнай падрыхтоўкай, дакладным выкананнем і магутным размахам — адзначыла ўчора сваё 50-годдзе Віцебская паветрана-дэсантная дывізія, сфарміраваная ў Быхаве на Магілёўшчыне.

Пасля параду і мітынгу ля Вечнага агню на плошчы Перамогі былі ўскладзены вянкі да магіл аднапалчан на могілках горада. Гледачы, якія сабраліся на стадыёне "Дынама", сталі сведкамі дакладнага прызямлення парашутыстаў, дэманстрацыі сілы і спрыту "блакітных берэтаў", а на плошчы Свабоды публіка мела магчымасць "памацаць" магутную баявую тэхніку і пакаштаваць салдацкай кашы з палявых кухань.

У Палацы культуры прафсаюзаў адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны ратнаму шляху 103-й гвардзейскай дывізіі. Рознае было на гэтым шляху: і пераможныя сутычкі з адборнымі эсэсаўскімі часцямі, і бясслаўная Чэхаславакія, і горкі Афганістан...

На юбілей па запрашэнню камандзіра дывізіі А.Скачкова з'ехаліся шматлікія госці, у якіх з дывізіяй звязаны самыя памятныя старонкі жыцця, прадстаўнікі дзяржаўнай улады, Міністэрства абароны, іншыя афіцыйныя асобы.

Ва ўрачыстасці прыняў удзел Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Мечыслаў Грыб.

Сяргей БУТКЕВІЧ, уласны карэспандэнт "Народнай газеты".



ТРЫПЦІХ ВІКТАРА ЖЫЛІНА

"Гэтых людзей трэба ведаць у твар..."

❑ Мастак Мікалай Селяшчук

❑ Прафесар Беларускай Акадэміі мастацтваў Май Данцыг

❑ Пісьменнік Васіль Быкаў





Указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб узнагароджанні выкладчыкаў Беларускага універсітэта культуры Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць узнагародзіць Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь:

ДЗЯМЕШКА Лілію Адамаўну — дацэнта кафедры бібліятэказнаўства.

РОВІНУ Раісу Аўрамаўну — дэкана факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ.

16 студзеня 1995 г., г.Мінск. № 3522-XII

Аб узнагароджанні 103-й паветрана-дэсантнай дывізіі Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, дасягнутыя поспехі ва ўмацаванні абараназдольнасці краіны і ў сувязі з 50-годдзем з дня фарміравання ўзнагародзіць 103-ю паветрана-дэсантную дывізію Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ.

16 студзеня 1995 г., г.Мінск. № 3524-XII

Веру ў адраджэнне Беларусі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У якасці прыкладу дзейснасці Савета эканамічнага супрацоўніцтва назаву найбольш важныя дакументы, прынятыя з яго ўдзелам. Гэта дагавор аб развіцці шырокамаштабнага супрацоўніцтва ў галіне эканомікі, навукі і тэхнікі паміж Беларуссю і Германіяй, а таксама пагадненне аб садзейнічанні ажыццяўленню і ўзаемнай абароне інвестыцый, якое стварае істотныя прадпасылкі для забеспячэння прававых гарантый нямецкім інвестарам у Беларусі і беларускім — у Германіі. Пасольства ФРГ унесла значны ўклад у заключэнне гэтых дагавораў і часткова каардынавала ход перагавораў.

Наступны важны праект супрацоўніцтва на дзяржаўным узроўні, падтрымліваемы федэральным урадам, — стварэнне прадстаўніцтва германскай эканомікі, якое будзе першай ступенькай будучай сумеснай беларуска-германскай гандлёва-прамысловай палаты. Яно арганізуецца аб'яднаннем гандлёва-прамысловых палат Германіі з мэтай аказання дапамогі нямецкім фірмам, якія жадаюць працаваць у Беларусі, а таксама беларускім прадпрыемствам, якія хочуць супрацоўнічаць з Германіяй. У прадстаўніцтве ім будуць даваць інфармацыю і кансультаваць. Зараз мы вядзём перагаворы з беларускім урадам аб форме і статусе такога прадстаўніцтва і спадзяёмся, што яго адкрыццё ў Мінску адбудзецца ў пачатку наступнага года.

— А якія, пан Рэгенбрэхт, асноўныя прыярытэты Германіі, калі справа датычыцца доўгатэрміновых праграм дзелавога партнёрства з нашай краінай?

— Зыходзячы з існуючых на Беларусі ўмоў і магчымасцей для інвестараў, якія часткова яшчэ ўтрымліваюць няяснасці і праблемы, прыярытэты нямецкага боку зараз абмяжоўваюцца больш простымі формамі супрацоўніцтва. У гэтых выпадках лягчэй дасягаць згоды і рэалізоўваць праекты з найбольшымі гарантыямі.

Нядрэнна зарэкамендавалі сябе формы супрацоўніцтва, якія існуюць ужо доўгі час і маюць свае традыцыі. Так, паспяхова ідуць многія гандлёвыя аперацыі, на якія распаўсюджваюцца гарантыі германскага ўрада і страхавога таварыства "Гермес". Мы зыходзім з таго, што беларускі бок хутка ліквідуе існуючыя праблемы, звязаныя з узнікненнем запазычанасцей па плацяжах, і што супрацоўніцтва ў гэтай галіне зноў пойдзе поўным ходам. Як правіла, добра рэалізуюцца і праграмы, калі фірмы пастаўляюць загатовачны матэрыял, а затым сумесна з беларускімі партнёрамі выпускаюць гатовыя вырабы. Характэрны прыклад — вытворчасць вырабаў жаночай галантарэі сумесна з фірмай "Трыумф". Для гэтага з Германіі прывозяцца загатоўкі тэкстыльных вырабаў, тут яны шыюцца і зноў адпраўляюцца ў ФРГ. У гэтым жа радзе можна назваць і паслугі ў галіне аўтамабільнага сервісу. Выдатна ідзе работа ў нядаўна адкрытых прадстаўніцтвах фірм "Фольксваген" і "Мерседэс-Бенц АГ".

Больш складана абстаяць справы ў вытворчым сектары. Гэтую сферу дзейнасці трэба пашыраць: яна азначае ўкараненне новых тэхналогій і стварэнне рабочых месцаў у Беларусі, што спрыяльна паўплывае на развіццё вашай эканомікі. Аднак для гэтага павінна быць прадпасылка — магчымасць для нямецкіх інвестараў набываць ва ўласнасць зямлю. А таксама неабходна высокая ступень прававых гарантый і прадказальнасць развіцця агульнай сітуацыі.

Акрамя таго, ёсць шэраг праблем, якія датычацца адміністрацыйных рашэнняў па пытаннях стварэння рамачных умоў для прыцягнення інвестыцый. У гэтай сувязі я хачу нагадаць, што Беларусь з'яўляецца не адзінай краінай, у якую нямецкія прадпрымальнікі могуць укладваць свае капіталы. Яна знаходзіцца ў канкурэнцыі з многімі дзяржавамі. І хоць мае пэўныя перавагі: выгаднае геаграфічнае становішча, а таксама кваліфікаваных спецыялістаў, але калі агульныя рамачныя прававыя і адміністрацыйныя ўмовы і гарантыі не будуць створаны, то нямецкі прадпрымальнік, хутчэй за ўсё, аддасць перавагу Чэхіі, Венгрыі, Польшчы або прыбалтыйскім краінам. Таму можна парэкамендаваць дэпутатам прадоўжыць работу ў дадзеным напрамку больш інтэнсіўна, каб забяспечыць такія прававыя гарантыі замежным інвестарам, якія прадастаўляюць іншыя краіны.

— Для нашай рэспублікі настаў зараз не самы лепшы час. Напэўна, пасольства займаецца аналізам і адсочваннем эканамічнай сітуацыі ў краіне знаходжання. Пазначце, хоць бы ў агульных рысах, пан Рэгенбрэхт, вашыя прагнозы на нашу бліжэйшую будучыню. І як у святле гэтых вывадаў могуць складвацца дзелавыя кантакты?

— Сапраўды, эканамічнае становішча ў Беларусі сёння цяжкае. Пасля распаду Савецкага Саюза ўмовы для эканомікі зусім змяніліся. Цяпер рэспубліка вымушана плаціць за сыравіну амаль па сусветных цэнах і сама клапаціцца аб збыце сваёй прадукцыі. На жаль, вашая краіна з часу абвяшчэння незалежнасці да сённяшняга дня спрабавала толькі падтрымліваць вытворчасць на пэўным узроўні і зацягнула структурныя пераўтварэнні, прыватызацыю і раздзяржаўленне прамысловасці. У выніку страчаны тэрміны. Іншыя краіны, такія, як Расія і прыбалтыйскія дзяржавы, уваходзяць у рынак значна хутчэй і больш дынамічна. Для дабрабыту насельніцтва важна, каб вытворчасць функцыяніравала эфектыўна і прадукцыя знаходзіла збыт на сусветным рынку. Таму структурныя пераўтварэнні неабходны для дасягнення стабільнасці. Іх трэба праводзіць у комплексе. Урад прапанаваў праграму мер па пераадоленню эканамічнага крызісу. Яна ўзгоднена з Міжнародным валютным фондам. Пацверджана таксама воля да правядзення эканамічных рэформ. Калі гэтая праграма і гэтыя рэформы ў пэўныя тэрміны будуць ажыццёўлены (а тут я аптымістычны), то хутка насельніцтва адчуе змены да лепшага.

— Дзякую, пан Рэгенбрэхт, за шчырую размову. Спадзяюся, што 1995 год яшчэ больш зблізіць нашы народы, падвёўшы канчатковую рысу пад змрочным часам варожасці і супрацьстаяння.

Валянціна МЕНШЫКАВА, Белінфарм.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб узнагароджанні Аладзьева Я.В. і ВАйцяховіча У.Г. Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

За заслугі ў развіцці і прапагандзе самадзейнага музычнага мастацтва ўзнагародзіць салістаў вакальнага ансамбля ветэранаў "Памяць сэрца" АЛАДЗЬЕВА Яўгена Васільевіча і ВАЙЦЯХОВІЧА Уладзіміра Гаўрылавіча Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ.

16 студзеня 1995 г., г.Мінск. № 3520-XII

Беларусь разбазаривает национальное достояние

Как нас облапошивают с калийными удобрениями

Каждый раз, когда приходится слышать о запоздалых инвестициях в нашу экономику, о выплате валютных долгов за энергоносители, я задаю себе несколько вопросов. Можно ли эту самую валюту зарабатывать самим? Не разбазариваем ли мы свое национальное достояние? Почему в угоду личным амбициям какого-то конкретного чиновника страдает вся республика?

Виктор ХОРОШКО

Вопросы эти возникают не на голом месте. Возьмем хотя бы экспортные договора "Беларуськалия", самого постоянного и объемного поставщика долларов, марок и т.д. в республику. Все ли тут нормально? Далеко не все.

"Беларуськалием" заключен контракт с фирмой "Арви" (Литва), по которому литовцы закупают у белорусов удобрения. Ничего, казалось бы, криминального в этом соглашении нет. Есть наш производитель, которому не возбраняется заключать подобные контракты, есть потребитель, который у производителя продукцию покупает.

Что же происходит на самом деле?

Два года назад между Литвой и Беларусью существовало межправительственное соглашение, которое, кстати, регулировало торговые взаимоотношения, касающиеся в том числе и купли-продажи калия. На внутренний литовский рынок удобрения отпускались по 35 долларов за тонну. Какая-то часть нашей продукции покупалась их крестьянами, какая-то, возможно, шла на перепродажу. Все регламентировалось документами.

Но вот перестало действовать межправительственное соглашение. Стороны сейчас не имеют друг перед другом никаких обязательств, что ставит литовцев вровень с другими западными импортерами. И покупать калий они должны по ценам, сложившимся на мировом рынке, — 55—78 долларов за тонну. Литовский крестьянин такую цену не тянет. И поставки в Литву, кажется, должны были снизиться.

Однако не так давно "Арви" заключила новый контракт на сумму 2.816.500 (!) долларов США (контракт подписан директором фирмы "Маркетинг" "Беларуськалия"). Одновременно фирмой "Арви" заинтересовалась Федеральная служба контрразведки России. И не только заинтересовалась. Заставила "Арви" вернуть в Россию... 6000 тонн удобрений.

Снова вопросы.

Теперь уже с ответами.

Еще в 1993 году калининградская фирма "Неман" заключила с "Беларуськалием" договор на закупку 15 000 тонн мелкозернистого калия. Благополучно получив его по мизерной, 20 долларов за тонну, цене (межправительственные с Россией соглашения предусматривают такие цены) и доставив в Литву, коммерсанты "прошли" все российские таможенные препоны со стороны Калининградской области. По крайней мере, в их документах отметка о прохождении российской таможни наличествует. Дело оставалось за малым — доставить груз за рубеж — реэкспортировать. Что и начало осуществляться до марта 1994 года, пока "Беларуськалий" не расторгнул договор. Насторожило ФСК России то обстоятельство, что груз в российской области не появлялся. При детальной проверке выяснились и другие обстоятельства.

После возвращения 6 000 тонн калия в Калининград, казалось бы, "Арви" должна была отказаться от "заигрываний" с "Беларуськалием". Но авансовая предоплата была произведена. Это раз. Во-вторых, ждали калия и иностранные партнеры, а они договорные обязательства чтут свято. Иначе — штрафные санкции. И немалые.

В "Арви" это тоже понимают прекрасно. Поскольку контракт между "Беларуськалием" и " Арви", заключенный в феврале 1994 года, был выполнен, в августе заключен новый контракт.

Выгодно это или невыгодно "Арви", судить им. Как, впрочем, и выполнять обещания перед иностранным партнером. Но выгодно ли это Беларуси?

Во всей этой истории есть и другие подводные камни. Первое. Как оградить "Беларуськалий" от реэкспорта удобрений, поставляемых в страны Прибалтики? Ведь в каждом контракте ПО предусматривает санкции к покупателям товара за перепродажу. Правда, ни одна реэкспортная продажа не обжалована. И только потому, что нельзя достать документов, доказывающих вину партнеров. На запросы "Беларуськалия" соответствующие службы отвечают молчанием.

Второе. Продавать и экспортировать белорусские удобрения официально могли только "Беларуськалий" и ВО "Белагроинторг". У них свои рынки сбыта и постоянные покупатели.

Третье. Несмотря на штрафные санкции против реэкспорта, предусмотренные в контракте, фирма "Арви" трактует свое право, право собственника товара, за который заплачено. То есть считает возможным реэкспорт. И в этом случае необходимо, чтобы цена на продаваемые в Прибалтику калийные удобрения равнялась цене продажи в Республику Польша и другие прилегающие к территории Беларуси страны. Но это лишь один момент. Другой заключается в том, что на кусочек российской территории (Калининградскую область) цена тоже должна быть одинаковой со странами Балтии.

Нельзя не сказать и о том, какой имидж подобные операции создают белорусам на западном рынке. Рынок калийных удобрений сформирован, разделен на сферы влияния. А в ЕЭС уже был принят антидемпинговый закон против поставки калийных удобрений из Беларуси, России и Украины. Сегодня мы лишены западного рынка примерно на 700 тысяч тонн. А продаваемый из Прибалтики товар имеет документы белорусского происхождения. И где гарантии того, что он не попадет в страны ЕЭС по заниженным ценам?

Если с фирмой "Арви" "Беларуськалий" может вести "разборки" в судебном порядке, то на уровне государств этот вопрос решать надо при заключении межправительственных соглашений. Тем более что случаи контрабандного вывоза калия были и раньше. Никто еще не забыл, как "облапошивали" белорусов год назад. Механизм до боли прост и подобен всей нашей действительности. Некоторым хозяйствам фирмами "давались задания" на закупку калия по внутриреспубликанской цене. А потом груз уходил через границу и преспокойно реэкспортировался, и кто-то получал значительные дивиденды от разницы в ценах.

В мае возле Молодечно был "прихвачен" один из таких контрабандистских составов. Канал прикрылся, нашелся другой. Прикрылся второй, дельцы придумали третий.

В отношении торговли с Россией разговор особый.

Еще в бытность Советского Союза наш экспортный калий составлял значительную часть союзного. Выгодно было великой стране "строгать" доллары, только малая часть которых направлялась ПО "Беларуськалий".

Развалился "могучий", положение дел изменилось. Сегодня объединение получает 50 процентов валютной выручки и заинтересовано в ее увеличении. В России места по добыче калия расположены глубоко в стране. Доставка их до морских портов обходится дорого. Проще заключить с Беларусью выгодное соглашение и покупать удобрения в западные районы России по малой цене. И из того же Калининграда продавать куда надо.

Как же навести порядок в торговле калийными удобрениями?

Прежде всего надо, чтобы Госкомитет по внешним экономическим связям, Министерство экономики, Таможенный комитет оперативно реагировали на запросы "Беларуськалия" и предоставляли информацию, дающую право на взыскание штрафных санкций. А они немалые. 25 процентов от общей стоимости сделки.

Если же все будет идти как идет, придется объединению создавать свою службу, чтобы "разыскивать" и "откапывать" нужные документы. Но стоит ли идти на такие расходы, если в ведомствах вся информация имеется. И она должна была насторожить соответствующих должностных лиц.

Зима! Не торжествует ни крестьянин, ни горожанин

Еще раз о том, почему все-таки надо повышать цены на сельхозпродукцию

Павел СТАСЕВИЧ

"Зима. Что делать нам в деревне?" — спрашивал когда-то поэт.
Вопрос актуален и поныне. Ну что сделаешь сейчас в деревне, если на учете у колхоза-совхоза каждый прицеп вывезенного на поля навоза?! Какого урожая ожидать и на какие прибыли надеяться?
Скучно, словом, этими зимними днями в колхозно-совхозных кассах.
А вот в городах настроение другое: люди заходят в магазины, держа руки там, где сердце. Особенно те, кто живет на пенсию или пособие. Да и зарплаты у большинства такие, что от прилавков приходится уходить, как от греха.
Понятно, что полуголодному человеку трудно внятно объяснить, что не село виновато в таких ценах.
— А кто же?! — обижаются многие.— Гноят все, воруют. А нам — плати...
"О-хо-хо... Гноят и воруют у нас повсеместно..." — тяжко думаю я. И иду за ответами к знающему человеку. Фамилия его Дроздов, зовут Анатолием Ивановичем. И возглавляет он Главное управление экономики Министерства сельского хозяйства.

— Вспоминаю я, Анатолий Иванович, что и раньше наш аграрный сектор хворал не раз. И тяжко...

— Да, было дело. Но тем не менее необходимые условия для его дальнейшего развития имелись.

— Докажите...

— Вот цифры. Наибольший рост темпов производства сельскохозяйственной продукции был достигнут в 1987—1990 годах. В республике на душу населения производилось 117 килограммов мяса, 734 — молока, 772 — зерна, 357 штук яиц.

Причем вся продукция, реализованная государству, **была рентабельна**. Говоря проще, имелась прибыль для ведения расширенного воспроизводства.

— Ностальгия...

— Да нет! Просто здравый смысл. А он говорит: отсутствие четкого плана, неоправданная поспешность в проведении рыночных реформ сегодня поставили на грань выживания даже крепкие в недалеком прошлом хозяйства. Об этом красноречиво говорят следующие факты.

Полная либерализация цен на промышленную продукцию, тарифы, услуги, расценки произведена в республике с 1 января 1991 года. В связи с этим рост цен текущего момента к уровню 1991 года на продукцию, потребляемую сельским хозяйством, составил: на электроэнергию — в 281 тысячу раз, на дизельное топливо — в 237, на бензин — в 100, на комбайны — в 149, на тракторы МТЗ — в 80—67, на минеральные удобрения — в 76—30 тысяч раз! При этом повышение цен произошло резко, то есть все затраты на производство продукции рабочему классу возмещались, обеспечивалась также определенная сумма накоплений. И город этой свободой пользовался в свою пользу.

— Но свободу дали и селу...

— Дали. На бумаге — с 1 января 1992 года. С того времени закупочные цены на зерновые увеличены в 6 тысяч раз, сахарную свеклу — в 5,7, крупный рогатый скот — в 5,4, свиней — в 11,4, птицу — в 16,5, яйцо — в 20,4 тысячи раз. Сравните. И тогда каждый, надеюсь, поймет, кто кого "доил" и "доит" в стране: село город или наоборот.

Чтобы приобрести сегодня тонну дизельного топлива, необходимо продать 469 килограммов крупного рогатого скота или 4105 килограммов молока. В 1991 году на эти цели требовалось соответственно 12 и 100 килограммов, то есть в 39 и 41 раз меньше.

— И что же в итоге?..

— За истекшие три года село практически не покупает технику, в три раза снизило приобретение удобрений, в два раза меньше заготовило органики. До минимума сократились поставки средств защиты растений.

— Выход?

— Сельское хозяйство обязано резко повысить цены на свою продукцию, чтобы возместить те затраты, которые накопились в течение 1992—1994 годов.

— А если без "резкого повышения"?

— А если "без", то село уже в нынешнем году провести весенний сев в полном объеме не сможет. Это в конечном счете приведет к обвальному падению объемов производства.

Плюс ко всему потребуется значительное увеличение импорта сельхозпродукции. А это в условиях дефицита валютных ресурсов увеличит экономическую зависимость от стран ближнего и дальнего зарубежья. В результате собственная перерабатывающая промышленность и сельскохозяйственное машиностроение вынуждены будут свернуть производство, что повлечет за собой рост безработицы. Разрушится не только сельское хозяйство, но и экономика Беларуси в целом.

— Но наш крестьянин не бастует, не шумит...

— Терпеливый. Он может только надеяться на здравый смысл.

Сельский товаропроизводитель, являясь практически инвестором всех отраслей народного хозяйства, остается последним, самым уязвимым и ущемленным в экономических интересах звене хозяйственного комплекса. По сути — его заложником. А без его поддержки реформы в республике проводить невозможно.

— Село, теряя покупательскую способность, уже становится причиной снижения объемов производства практически во всех отраслях. Не за что сельчанину покупать продукцию горожан...

— Да. Не отдавая государственные приоритеты сельскому хозяйству, мы совершаем стратегическую ошибку, социальные последствия которой могут обернуться серьезными потрясениями для нашего молодого государства.

— И что же говорит здравый смысл?

— Об одном: необходимо установление ценового паритета между сельским хозяйством и промышленностью. Ведь невозможно все время производить продукцию и продавать ее себе же в убыток! Все мы живем в реальном мире. Раньше или позже долги селу придется возвращать, суть лишь в том, **какой ценой** это будет сделано. Если государство оставляет за собой право регулирования цен на продукты питания, то оно должно принять решение о компенсации селу потерь, связанных с непаритетом цен на сельскохозяйственную продукцию, т.е. невозмещенных через цену затрат на ее производство.

В условиях развивающихся рыночных отношений в сопредельных государствах это чревато массовым вывозом более дешевых продуктов из республики. И это мы уже имеем. Следовательно, чтобы обеспечить приоритетное развитие сельского хозяйства и защитить собственный рынок, сейчас стоят две сложные, но вполне разрешимые проблемы.

Первая: социальная защита населения, которому следует **сполна** компенсировать удорожание цен на продукты питания.

Вторая: безотлагательное принятие решения о повышении закупочных цен. На молоко — в 2,8 раза, крупный рогатый скот и свиней — в 1,8 раза.

В дальнейшем закупочные цены необходимо увеличивать исходя из роста цен на энергоносители и другие материально-технические ресурсы.

Это — вынужденные меры. Но лишь они предотвратят не только развал сельского хозяйства, но и остановку перерабатывающих предприятий, мясокомбинатов, молочных заводов.

После обилия "чистой" экономики и цифр лично мне захотелось чего-нибудь лирического. Вам, дорогие читатели-едоки, надеюсь, тоже.

И я снова вспомнил классика. Но уже веселенькое: "Зима! Крестьянин, торжествуя, на дровнях обновляет путь..."

Н-да. Что-то не получается нынче веселенького. И зимы настоящей не видно, и настоящего крестьянина извели, и торжественности особой нет...

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

ДА УВАГІ БАЦЬКОЎ!

Даставім дзеткам радасць

Дзеткам патрэбны кніжкі. Прыгожыя, яркія, з малюнкамі. Што ні кажы, а такіх кніжак, каб дзіцячыя вочкі загарэліся радаснымі агеньчыкамі ад прывабных, захапляючых маленькае сэрцайка і душу малюнкаў, сюжэтаў, у нас, на Беларусі, зусім няшмат. Няўжо зямля наша збяднела на таленавітых мастакоў? Не. Узяць бы дзіцячыя кнігі, праілюстраваныя Аленай Лось, Наталляй Паплаўскай, Уладзімірам Савічам, Валерыем Славуком... Ёсць яшчэ і маладыя мастакі, якія крыху па-іншаму, па-свойму, бачаць сучасную дзіцячую ілюстрацыю.

Выпускнік архітэктурнага факультэта Беларускай політэхнічнай акадэміі Уладзімір Пуставалаў і Ірына Пуставалава, якая скончыла мастацкую акадэмію (аддзяленне прамграфікі), напрацавалі шмат матэрыялаў, якія могуць выліцца, аформіцца ў маляўнічыя дзіцячыя настольныя гульні, малюнкі, коміксы.

Свае ілюстрацыйныя версіі прапануюць мастакі да любімых дзіцячых кніг: "Волшебник Изумрудного города", "Повелитель драконов"; створаны комікс "Шпага Рианона". Мастакі распачалі працу над дзіцячым серыялам прыгодніцкіх гісторый пра двух хлопчыкаў "Женька и Сенька — настоящие искатели приключений".

Рэдакцыя "Народнай газеты" сумесна з выдавецтвам "Парадокс" выпускаюць першую кнігу з гэтага серыяла. Хутка яна паступіць у продаж. Мастакі плануюць стварыць каля 20 кніг. Так што, паважаныя бацькі, зазірнуўшы ў кнігарню, не прайдзіце міма "Женьки и Сеньки..." Вы прынесяце многа радасці сваім дзеткам, набыўшы гэтыя кніжныя навінкі.

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.

ЗЛАБАДЗЁННЫЯ РАДКІ

Сяргей ГРАХОЎСКІ

Зацугляны Пегас

Пераклічка з В.Віткам

Разам з плугам і Пегас
Абагулены ў калгас.
Па загаду старшыні
Адрабляў ён працадні,
Прэлую салому грыз
І спяваў пра кок-сагыз.
Потым залыгалі музу
Гімн складаць пра кукурузу,
Ён, прывязаны да плоту,
Пеў пра ўдарную работу.
Хамутом нацерлі холку,
А уславіў ён праполку
І Героя-старшыню,
З ім — усю яго радню.
Так "аблашчаны" Пегас
Дагараў і ледзь не згас.
Ды абрыдзела лухта, —
Вылузаўся з хамута
І шчаслівы іго-гоча,
Бо спявае, што захоча.
Там, дзе днюе, дзе начуе,
Яго кожны добра чуе,
А брыкне начальству ў лоб,
Зноў раве яно: "Пак-л-л-ёп!
Ты, што пішаш і што кажаш,
Нас гарачым дзёгцем мажаш?..
В результаце этат вздор
Аправергнет пракурор.
Есьли ўсё жэ ты Пегас,
Лучшэ паслужы для нас,
А паднимеш нас на смех,
загрымиш в калбасный цэх!"
...Хоць мінуў "свабоды" час,
Не адумаўся Пегас.

2—5/I-95 г.

Нагуляліся

Ну, пагулялі ў "дэмакратыю"?
І ў "незалежных" пабылі?
Нам зноў заткнулі глоткі ватаю
Шчаслівай долі кавалі,
Суседнія, а больш тутэйшыя,
Пра свой забыўшыся народ,
Глядзяць на Усход,
заўсёды "меншыя",
І сніцца трыццаць сёмы год,
Меч і жалезная рука,
Каб зноў зацыкала ЦэКа,
Бо ўсе яны з тае фармацыі,
Што вырakліся роднай нацыі,
І маці, сцяўшы зубы, слухае,
Калі яе завуць "старухаю".
Спрадвечны не ўзлюбілі герб, —
Бліжэй ім малаток і серп,
Яны сваю шануюць шкуру,
Хлусню, уладу і цэнзуру,
Каб весці змучаны народ
Да камунізма, "упярод!",
Каб ён імя свайго не меў,
Аглух, аслеп і анямеў.

4/I-95 г.

Дарожныя экспромты

Майстры ашуканства, хлусні
і падману
Штодзённа балююць.
Няўжо ім Багі
Сыплюць з нябёсаў салодкую
манну,
Даруюць злачынствы, даруюць
даўгі?
У іх — і далары, і золата злiткі,
Курорты ў іх на Канарах штогод,
Таму, што умеюць абдзерці да ніткі
Яны беларускі няшчасны народ.

❑

Начальнік цягне ў дзве рукі,
Сумленныя — ідуць у жабракі.

❑

Хай горшы кіраўнік, ды новы,
І каб не ведаў роднай мовы.

❑

Спалоханы хапуга здуру
Трымаецца за жорсткую цэнзуру.

❑

Аж у міністры ён з парторга
Дапяў з дыпломам ВПШа,
Хоць сам з маленства і да морга
Не ведаў, ці была душа.

❑

Так, як жывём, ці варта жыць?
Лепш галавою налажыць.

❑

Цяпер я не баюся кары,
Таму, што думаю, — раблю,
Бо ўжо не ўзлезу сам на нары
І трыста грам не зараблю.
Я не ірвуся за мяжу,
Лепш дома праўду раскажу,
Хай нават голад даканае,
А хлус ніколі не пераканае,
Таму ні перад кім не гнуся,
Бо веру роднай Беларусі.

❑

Будзь літасцівы, Дзевяноста
пяты, —
Не наступай ты нам на пяты
І не зацягвай больш сіло,
Каб ачунялі горад і сяло.

P.S. Буду ўдзячны кожнаму, хто пакрыўдзіцца — значыць, пазнаў сябе, а гэта прыемна аўтару.

А ШТО Ў ПРАВІНЦЫІ?

А ў нас цяпер газ

Чырвоную стужку перарэзалі на газаразмеркавальнай станцыі Экімань каля Наваполацка — сюды пракладзена 115-кіламетровая нітка газапровода з Новалукомля. Цяпер на прыродны газ перавядуць не толькі пліты ў кватэрах гараджан, але і цэлую Наваполацкую ЦЭЦ, якая спальвае штосутачна 2—3 тысячы тон мазуту.

Мазут жа, калі пастаўкі яго захаваюцца, будзе пушчаны на глыбінную перапрацоўку.

Мова, зразумелая ўсім

У Хоцімскім раёне яе называюць "мовай дружбы", якая і сёння моцна звязвае беларусаў з жыхарамі суседніх раёнаў Бранскай і Смаленскай абласцей. Газета "Магілёўскія ведамасці" паведаміла аб чарговай сустрэчы кіраўнікоў адміністрацый расійскіх раёнаў і кіраўнікоў Хоцімшчыны для падпісання пагаднення аб супрацоўніцтве ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, культуры і спорту.

Не патрэбен перакладчык для рабочых Хоцімскай ПМК-276 і жыхароў рускага райцэнтра Ершычы: беларускія будаўнікі сумесна з АТ "Саюз" будуюць суседзям сярэднюю школу.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб узнагароджанні групы работнікаў цэнтра беларускіх народных рамёстваў "Скарбніца" Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

За вялікі ўклад у справу захавання і развіцця беларускіх народных рамёстваў, высокае прафесійнае майстэрства ўзнагародзіць Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь:

КУЖАЛЕВУ Святлану Васільеўну — вышывальшчыцу.

